# Навіны філатэліі

14 лістапада 2025 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Беларускаму радыё 100 гадоў».

Дызайн А. Мядзведзь.
Марка друкавалася ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц. Непагодзіна».

15 лістапада 2025 года беларускаму радыё спаўняецца 100 гадоў. Менавіта ў гэты дзень далёкага 1925 года ў Мінску адбылося ўрачыстае адкрыццё шырокавяшчальнай радыётэлефоннай станцыі, а ў 18:30 у эфіры ўпершыню прагучалі словы: «Увага! Гаворыць Мінск!..».
Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Генеральным прадзюсарскім цэнтрам Беларускага радыё.
У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне на паштамце Мінска (у «Паштовым салоне») будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/node/10906*